парэформеннай вёсцы, дзе выспявалі ў т.л. і рэв. настроі. *В.І.Еўмянькоў.*

**ГУТАРКОВАЯ МОВА**, асаблівая разнавіднасць літаратурнай мовы, якая выкарыстоўваецца ў неафіц. зносінах і проціпастаўлена кадыфікаванай кніжнай мове. Функцыянаванне Г.м. падпарадкуецца шэрагу прынцыпаў, сярод якіх свабода выбару сродкаў выражэння, моўная эканомія і суб'ектыўная ацэнка. Яны абумоўліваюць спецыфічныя прыкметы Г.м.: шырокую варыянтнасць, эліптызм, ацэначнасць, семантычныя трансфармацыі (гал. чынам метафарызацыю), павышаную экспрэсіўнасць і інш. Для Г.м. уласцівыя наддыялектныя, агульнанац. характарыстыкі, і адначасова яна мае рэгіянальныя асаблівасці.

У Г.м. назіраецца выкарыстанне прастамоўнай лексікі, дыялектызмаў, прафесіяналізмаў, жарганізмаў («дрыхнуць», «картопля», «задраіць» 'шчыльна закрыць', «пара» 'дзве акадэмічныя гадзіны'), метафар, заснаваных на пераносе назваў жывёл, птушак, насякомых і іх дзеянняў на чалавека («варона» 'няўважлівы чалавек', «ціўкаць» 'падаваць голас'), эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі («дачушачка», «вятрыска»). На граматычным узроўні выкарыстоўваюцца дзеясловы са значэннем аднаразовага дзеяння («стук», «лязь», «скок»), ужываюцца формы дзеясловаў аднаго ладу ў значэнні другога («ці не падаў бы ты мне кнігу?»), назіраецца тэндэнцыя да замены шматслоўных найменняў аднаслоўнымі («неўралагічнае аддзяленне — неўралогія»), адсутнічаюць дзеепрыметныя і дзеепрыслоўныя словазлучэнні, выкарыстоўваецца адваротны парадак слоў («хацеў бы я вас зразумець»), пашыраны пытальныя і клічныя сказы, ужываюцца паўторы дзеяслова-выказніка для абазначэння працягласці дзеяння («гаварылі мы гаварылі», «думалі мы думалі») і інш. Сустракаюцца звароты, сінтаксічныя канструкцыі, якія перадаюць непасрэдную рэакцыю суразмоўцы — здзіўленне, ухваленне, адмаўленне, радасць і інш.

Г.м. даследуецца як катэгорыя стылістыкі і культуры маўлення, якая непасрэдна звязана з тэндэнцыямі развіцця літ. мовы, дынамікай яе нормаў у вуснай маўленчай практыцы, стылёвым размежаваннем вуснагутарковых і кніжна-пісьмовых стандартаў, развіццём працэсаў узаемадзеяння кніжнай і размоўнай лексікі ў СМІ, пры маст. перакладзе.

*Літ.*: Старасценка Т.Я., Урбан В.В., Шумчык Ф.С. Стылістыка беларускай мовы. Мінск, 2010; Рамза Т.Р. Беларускае гутарковае маўленне: сучасны стан. Мінск, 2011. Д.В.Дзятко.

**ГУТАРКОВЫ ВЕРШ**, гл. ў арт. *Народнае вершаскладанне.*

**ГУТКОВІЧ** Аляксандр Залманавіч (20.12.1920, в. Вярхоўе Бешанковіцкага р-на — 9.9.1989), беларускі рэжысёр тэлебачання, драматург. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1981). Скончыў Бел. тэатр. ін-т (1949). Працаваў у бел. тэатрах імя Я.Коласа і юнага гледача. З 1959 рэж. на Рэсп. студыі тэлебачання. У тэлевізійных паст. імкнуўся наблізіцца да літ. першакрыніцы, дэталёва распрацаваць характары персанажаў. З лепшых работ: тэлевізійныя спектаклі «Калі зліваюцца рэкі» паводле П.Броўкі (1961, і сцэнарыст), «Людзі на балоце» паводле І.Мележа (1965), тэлефільм «Уся каралеўская раць» (1970, з Н.Ардашнікавым, і сцэнарыст). Адзін з аўтараў п'ес «Юныя мсціўцы» (паст. 1957), «Праўда і шчасце» (паст. 1959), «Справа яе жыцця» (паст. 1961, 1962). Дзярж. прэмія Беларусі 1966.

**ГУТКО́ЎСКАЯ** Святлана Вячаславаўна (н. 6.9.1959, г. Какшэтаў, Казахстан), беларускі балетмайстар, педагог, мастацтвазнавец. Канд. філал. навук (1994). Скончыла Мінскі ін-т культуры (1982). Выкладае ў Бел. ун-це культуры і мастацтваў (з 1996 заг. кафедры). Адначасова з 1995 маст. кіраўнік ансамбля кафедры харэаграфіі Бел. ўн-та культуры і мастацтваў. Харэограф-пастаноўшчык сцэнічных нумароў на аснове бел. нар. танц. творчасці і сучаснай харэаграфіі. Гал. балетмайстар навагодніх прадстаўленняў «Галоўная ёлка краіны» (2001, 2009—11), рэсп. Балю выпускнікоў ВНУ Беларусі (2003—11), канцэртаў на міжнар. фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (2007, 2009) і інш. Лаўрэат 13-га Міжнар. фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (2000). Аўтар кн. «Гарадскія бытавыя танцы» (2008), «Асновы сачынення харэаграфічнай кампазіцыі» (2011).

**ГУ́ТНАЕ ШКЛО**, шкляныя вырабы, атрыманыя спосабам выдзімання, фармавання і дэкарыравання ўручную ў гарачым стане непасрэдна каля гутнай печы; від *шкла мастацкага.* У Беларусі Г.ш. дасягнула высокага маст. ўзроўню ў 16—17 ст. Вырабы — бакалы, кубкі, флаконы, фігуркі жывёл, шкляніцы — аздабляліся ляпным дэкорам, каляровымі ніткамі, жгутамі і г.д. У 16—19 ст. выраблялася пераважна ў дробных *гутах.* У 2-й пал. 19 ст. ў сувязі з узнікненнем шклозаводаў і ўстаноўкай пнеўматычных прыстасаванняў для выдзімання посуду ў формы прыйшло ў заняпад. Як прадукцыя масавай вытворчасці Г.ш. пашырылася ў 1960 — пач. 1990-х гг. на шклозаводзе «Нёман». Сярод мастакоў, якія працуюць у Г.ш.: В.Дзівінская, У.Жохаў, Т.Малышава, У.Мурахвер, Л.Мягкова, В.Падліпаліна, В.Сазыкіна, В.Самахвалаў, Г.Сідарэвіч, А.Ткачова, С.Шэцік і інш.

**ГУ́ТШМІТ** (Gutschmidt) Карл (н. 12.9.1937, г. Фербелін, Германія), нямецкі мовазнавец і перакладчык. Д-р філалогіі (1976), праф. (1982). З 1967 выкладае бел. філалогію ў Берлінскім ун-це. З 1996 праф. Ін-та славістыкі Дрэздэнскага тэхнал. ўн-та (Германія). Даследуе праблемы бел. фразеалогіі, запазычанняў, стылістыкі, лексікаграфіі, параўнальнага вывучэння моў, дыяхроннага і сінхроннага вывучэння бел. мовы. Аўтар кн.: «Дзве новыя працы па беларускай